## Бібліяграфія


Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне,1941-1945:Энцыкл./Беларус. Сав. Энцыкл.;Рэдкал.:І.П. Шамякін(гал. рэд.)і інш.—Мн.: Бел СЭ,1990.—680 с.(4) л. карт.:іл.—С.47

Збор помнікаў гісторыі Беларусі. Гродзенская вобласць/ АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэд. Кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш.—Мн.: Бел СЭ, 1986.—371 с., іл.—С.85-86

Мальдзіс, А. Астравеччына, край дарагі… Нарыс.—Мн.: Маст. літ., 1977.—208 с.—С. 204


Скульптар – *Печкін Ярамір Аляксандравіч* (1926-1976).
Нарадзіўся у Ленінградзе. Закончыў Інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры ім. І. Рэпіна. Удзельнік мастацкіх выстаў з 1960 г. працаваў у манументальнай скульптуры і архітэктуры. Член Беларускага саюза мастакоў з 1958 г.


Аддзел бібліятэчнага
маркетынгу і сацыякультурнай
дзейнасці

**Адрас:**
**г. Астравец**
**Пр. Энэргетыкаў, 2**

Тэлефон: 8-01591-79-2-90


**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці**

# Помнік савецкім воінам і партызанам




**Астравец**
**2025**








Пачаткам афіцыйных мерапрыемстваў святкавання Дня Перамогі стала традыцыйнае шэсце да **помніка савецкім воінам і партызанам**, у ім прымаюць удзел ветэраны, кіраўніцтва раёна, сілавыя структуры, пагранічнікі, грамадскія аб’яднанні, навучэнцы.

*Помнік савецкім воінам і партызанам* устаноўлены ў Астраўцы ў 1975 годзе да 30-годдзя Перамогі над фашысцкай Германіяй. Помнік зроблены з бетону з чырвонымі палімерамі, вышыня скульптуры – 3,5 метра.

Двухфігурная скульптурная кампазіцыя – воін са сцягам у імклівым парыве і смяротна паранены салдат – размешчана на невялікім узгорку. Кантраст энергічнай фігуры сцяганосца з трагічна скаванай фігурай параненага воіна передае напружаны драматычны момант паядынку і перамогі над ворагам. Абедзве фігуры вырашаны абагульнена, буйнымі пластычнымі формамі. Злева каля падножжа ўзгорка нізкая выцягнутая па гарызанталі стэла з надпісам-прысвячэннем. Помнік гарманічна звязаны з навакольнай прасторай.





Цэнтральнай падзеяй святкаванняў стаў урачысты мітынг каля **помніка савецкім воінам і партызанам.** Прысутныя ўшаноўваюць памяць усіх герояў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны хвілінай маўчання.